## АДЗІНАЦЦАТАЕ, ВЯЧЭРНЯЕ, ПАСЯДЖЭНЬНЕ.

*(27 лістапада 1927 г.).*

Старшыня—тав. **Чарвякоў.**

**Старшыня.** Дазвольце чарговае пасяджэньне лічыць адкрытым. У парадку дня стаіць даклад аб пяцігадовым пляне гаспадарчага будаўніцтва.

Слова для дакладу мае тав. Галадзед.

**Галадзед.** Таварышы, на мяне ўскладзен абавязак высьветліць перад XI зьездам КП(б)Б напрамак і галоўныя галіны, па якіх павінна ісьці пэрспэктыўнае разьвіцьцё народнае гаспадаркі і культурнага будаўніцтва як СССР, так і БССР. Гэтая задача вельмі складаная таму, што выкладаць нашы думкі і прадбачаньні на далейшае разьвіцьцё—гэта азначае абмаляваць практычнае будаўніцтва сацыялізму ў бліжэйшыя пяць год.

Гаварыць аб дырэктывах па складаньні пяцігадовага пляну, якія павінны быць даны XI зьездам для ўсіх нашых кіруючых і плянуючых органаў—гэта значыць даць падставу для эканамічнай праграмы працы на пяць год.

У маю задачу ўваходзіць высьветліць падставы пяцігодкі народнай гаспадаркі СССР і БССР, але ў зьвязку з тым, што тэзісы ЦК УсеКП(б) па складаньні пяцігодкі падрабязна абгаворваліся на ўсіх сходах ячэек і што ўжо па гэтым пытаньні камуністычная партыя Беларусі ў часе дыскусіі выказала свае думкі і свае адносіны (больш як 99 проц. за тэзісы тав. Рыкава і толькі каля 1 проц. выказалася за контр-тэзісы апазыцыі), таму дазвольце мне спэцыяльна на тэзісах ЦК УсеКП(б) ня спыняцца, адзначыўшы, што і XI зьезд камуністычнай партыі Беларусі таксама аднагалосна зацьвердзіць праект дырэктыў па складаньні пяцігадовага пляну народнае гаспадаркі СССР і таксама аднадушна выкажа свае адносіны да прынцыповай палітыкі ЦК УсеКП(б) у разьвіцьці народнай гаспадаркі.

XI зьезд камуністычнай партыі, бязумоўна, павінен зазначыць, што дырэктывы, зьмешчаныя ў тэзісах ЦК УсеКП(б) па складаньні пяцігодкі правільна падагульваюць вынікі сацыялістычнага будаўніцтва за дзесяць год, а таксама зусім правільна вызначаюць асноўныя галіны далейшага разьвіцьця народнай гаспадаркі і сацыялістычнага будаўніцтва наогул. Таму ўся КП(б)Б павінна ажыцьцявіць гэтыя дырэктывы.

А цяпер дазвольце больш падрабязна спыніцца на пяцігодцы народнай гаспадаркі БССР. Спачатку некалькі заўваг.

1) Як ужо вядома, над складаньнем пяцігадовага пляну народнай гаспадаркі БССР адпаведныя плянавыя і гаспадарчыя органы працуюць больш як год, і мне давялося рабіць даклад аб падставах пяцігадовага пляну яшчэ на чэрвенскім пленуме ЦК КП(б)Б, але ў зьвязку з тым, што пачатковы год пяцігодкі па ўсім Саюзе ССР быў зьменены (першая пяцігодка ўключала пачатковым годам 1926—27 гаспадарчы год, а другі варыянт пяцігадовага пляну першым годам пяцігодкі ўклю-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА Рэспублікі Беларусь

чае 1927—28 год, а апошнім годам—1931—32 г. г.), таму і мы павінны былі зрабіць перасоўку на адзін год. У зьвязку з гэтым вы можаце бачыць у тых матар'ялах да пяцігодкі, якія вам разданы, некаторыя зьмены лічбавых паказальнікаў.

Акрамя таго, я павінен папярэдзіць вас, што і прапануемыя лічбы новага варыянту пяцігодкі таксама могуць мець зьмены, бо яны вельмі арыентыровачныя і падлягаюць усебаковай крытыцы і абмеркаваньню, не гаворачы аб тым, што на працягу выкананьня пяцігадовага пляну яны наогул магчыма будуць зьмяняцца ў зьвязку з тымі абставінамі, якія будуць складацца ў міжнародных узаемаадносінах.

Гэтымі лічбамі, якія распрацованы Дзяржаўнай Плянавай Камісіяй, якія маюцца ў вас на руках, я буду карыстацца толькі для таго, каб даць нагляднаы малюнак таму напрамку ў нашай гаспадарчай працы, які мы бярэм.

2) Ці можам мы зарганізаваць плянавае рэгуляваньне разьвіцьцём усёй народнай гаспадаркі? Гэтае пытаньне я стаўлю таму, што апазыцыя і ў прыватнасьці тав. Сьмілга ў сваёй прамове на апошнім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) даводзіў што, напрыклад, разьвіцьцё сельскай гаспадаркі ў нас праходзіць па тых самых галінах, як яно праходзіла і ў дарэвалюцыйны пэрыяд, гэта значыць так, як пры капіталістычнай сыстэме гаспадаркі.

Партыя лічыць, што гэты погляд ёсьць у прынцыпе памылковы, што ў нас ёсьць поўная магчымасьць зарганізоўваць плянавае кіраваньне разьвіцьцём народнай гаспадаркі.

Аб гэтым гавораць наступныя факты: папершае—тое, што ў руках дзяржавы сканцэнтраваны галоўнейшыя камандныя вышыні, як прамысловасьць, пры дапамозе якой мы можам мець значны ўплыў на разьвіцьцё ўсёй народнай гаспадаркі; падругое,—што ў галіне таваразвароту мы таксама маем у руках дзяржавы аграмаджаны сэктар (каапэрацыя), мы маем поўную магчымасьць рабіць уплыў на збыт і прасоўваньне прамысловых тавараў у сельскую гаспадарку.

Патрэцяе, што практыка нашае працы па плянавым рэгуляваньні гаспадарчым будаўніцтвам за апошнія гады паказала, што мы ўжо на справе маем магчымасьць загадзя прадбачыць, як галоўныя галіны і напрамак разьвіцьця нашае гаспадаркі, таксама і абхват, у якім гаспадарка наша будзе разьвівацца. Прыкладам гэтаму зьяўляюцца кантрольныя лічбы, складаемыя на год нашымі дзяржаўнымі плянавымі органамі.

З гэтае прычыны сама структура народнай гаспадаркі ў нашай дзяржаве, а таксама і задачы, якія стаяць перад пралетарыятам, абавязкова патрабуюць плянавага рэгуляваньня ўсім гаспадарчым жыцьцём нашай дзяржавы ў інтарэсах замацаваньня сацыялізму, і партыя павінна прыняць усе меры да таго, каб гэта плянавая праца займала ўсё большае і большае месца.

Складаньне пяцігадовага пляну і магчымасьць плянавага будаўніцтва—ёсьць ня толькі штодзенная праца, а гэта ёсьць таксама тая праца, якою адзначаецца, што пралетарская рэвалюцыя ўвайшла ў новы пэрыяд свайго разьвіцьця. Пяцігадовы плян сам сабою азначае, што пролетарская дзяржава ўступіла на шлях новага гаспадарчага будаўніцтва. Першы пэрыяд пралетарскай рэвалюцыі—гэта пэрыяд разбурэньня старога палітычнага ладу, а з гэтым і частковага разбурэньня матар'яльнае базы апарату гэтага палітычнага ладу. Тады, калі пралетарыят зруйнаваў палітычны апарат капіталістычнага панаваньня, ён адначасна задзяваў і той матар'яльны базіс, на якім грунтаваўся гэты палітычны лад.

Другі пэрыяд рэвалюцыі мы характарызуем, як пэрыяд адбудоўчы—гэта пэрыяд, калі пралетарыят, заваяваўшы ўладу, павінен быў залячыць усе тыя матар'яльныя раны, якія былі зроблены першым пэрыядам рэвалюцыі. Мы ўжо скончылі гэты адбудоўчы пэрыяд, і матар'яльныя страты рэвалюцыі ўжо намі аплачаны, больш таго, разам з адбудоўчым пэрыядам рэвалюцыі абнаўляўся і асноўны капітал. Напрыклад, у некаторых фабрыках і заводах мы за гэты адбудоўчы пэрыяд змаглі замяніць старыя машыны новымі машынамі, змаглі за гэты пэрыяд увесьці некаторыя дасягненьні апошняга слова тэхнікі.

Трэці пэрыяд—гэта пэрыяд, калі мы павінны правесьці закладку новых грунтоўных падвалін для далейшага гаспадарчага будаўніцтва. І вось гэты пэрыяд мы павінны праводзіць па строга плянавым парадку.

І вось для гэтага пэрыяду пяцігадовы плян мае вельмі вялікае значэньне.

Тыя абставіны, што мы будуем нашу гаспадарку ўласнымі сродкамі, што гэтых сродкаў у нас невыстарчальная колькасьць, мы павінны як найбольш эканомна і правільна разьмяркоўваць іх на паасобныя патрэбы сацыялістычнага будаўніцтва.

Асабліва плянавае прадбачаньне мае вялікае значэньне ў новым капітальным будаўніцтве, калі мы павінны рабіць капітальныя ўклады ў нашу народную гаспадарку, у вельмі значных разьмерах, і калі эфэкт ад гэтых капітальных укладаў будзе толькі вызначаны праз некалькі год.

Што такое плян? Як мы можам коратка адзначыць, фармуляваць значэньне пляну? На мой погляд, плян—гэта ёсьць практычная праграма партыі па будаўніцтву сацыялізму на бліжэйшыя пяць год, гэта ёсьць практычнае ажыцьцяўленьне тых пунктаў нашай партыйнай праграмы, якія запісаны ў ёй у галіне эканамічнай палітыкі. Плян—гэта ёсьць практычнае разьмеркаваньне вытворчых сіл краіны, якое ў першую чаргу павінна забясьпечыць і адпаведнае, больш пасьпяховае, разьвіцьцё гэтых самых вытворчых сіл. Пры дапамозе пляну мы павінны разьмеркаваць усе тыя сродкі, якія маюцца ў дзяржавы, так, каб мы найхутчэй пасоўваліся да сацыялізму і каб усё больш і больш пашыраўся дабрабыт працоўных мас.

Якія цяжкасьці ў нас ёсьць пры складаньні пяцігадовага пляну і пры яго ажыцьцяўленьні? Першае—гэта тое, што мы атрымалі ў спадчыну вельмі дрэнную гаспадарку. Усе ведаюць аб тым, што былая царская Расія больш як на 75 проц. залежала ад замежных прамысловых дзяржаў. Прамысловасьць у нас была разьвіта вельмі мала, сельская гаспадарка знаходзілася ў экстэнсыўным становішчы, слабае разьвіцьцё прамысловасьці таксама затрымоўвала інтэнсыўнае разьвіцьцё сельскае гаспадаркі, таму што ў нас быў недахоп прамысловых тавараў, прадукты прамысловасьці прывозіліся заўсёды з замежных дзяржаў. Экстэнсыўная-ж сельская гаспадарка таксама не магла забясьпечыць наліčча тэй колькасьці працаздольнага насельніцтва вёскі, якое па гэтай прычыне павінна было шукаць выхаду ў гарады. Адсюль і беспрацоўе. Вёска была галоўным пастаўшчыком беспрацоўных гораду, і цяпер, калі нам даводзіцца адбудоўваць нашу гаспадарку, горад ня можа ў некалькі год вырашыць гэтую задачу, гэта значыць ліквідаваць дыспрапорцыю паміж прамысловасьцю і сельскай гаспадаркай і асабліва ліквідаваць дыспрапорцыю паміж налічнам вольных рабочых рук і магчымасьцю іх гаспадарчага скарыстоўваньня.

Гэта задача патрабуе шмат гадоў для яе вырашэньня, тым больш яшчэ таму, што на працягу некалькіх год мы былі пад блёкадай шэрагу замежных капіталістычных дзяржаў.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Якія асноўныя галіны разьвіцьця народнай гаспадаркі павінны прадугледжвацца пяцігодкай? Пяцігодка павінна ў першую чаргу прадугледжваць абавязковае зьнішчэньне дыспрапорцыі паміж прамысловасьцю і сельскай гаспадаркай, гэта значыць, павялічваць ролю прамысловасьці ва ўсёй народнай гаспадарцы,—пашыраць, узмацняць індустрыялізацыю.

Дазвольце на гэтай галоўнейшай задачы мне трохі спыніцца. У нас, у БССР, былі чутны такія гутаркі, што формула індустрыялізацыя для БССР ня зусім падыходзіць, таму што гэтыя таварышы разумеюць індустрыялізацыю, як толькі разьвіцьцё тэй прамысловасьці, якая выробляе сродкі вытворчасьці, а ў нас-жа ў БССР гэтай магчымасьці нібыта вельмі мала. Ці правільна так тлумачыць формулу індустрыялізацыі? Не, няправільна. Індустрыялізацыя ўключае ў сабе ня толькі неабходнасьць разьвіцьця тэй прамысловасьці, якая выробляе сродкі вытворчасьці, але разьвіцьцё і тэй прамысловасьці, якая выробляе і спажывецкія тавары. Бязумоўна, тая прамысловасьць, якая выробляе сродкі вытворчасьці і абсталяваньне для нашых заводаў і фабрык, павінна займаць галоўнае месца ў ажыцьцяўленьні задач індустрыялізацыі. Але гэта было-б няпоўнае ажыцьцяўленьне гэтых задач, калі-б мы толькі на гэтым спыніліся, і не разгортвалі-б тэй прамысловасьці, якая абслугоўвала-б спажывецкія патрэбы працоўных мас.

Такім чынам, у задачу індустрыялізацыі ўваходзіць і абавязковае разьвіцьцё прамысловасьці, якая будзе абслугоўваць сельскую гаспадарку, якая будзе выробляць спажывецкія тавары, а трэба зазначыць, што ў БССР ёсьць шмат спрыяючых умоў для разьвіцьця прамысловасьці, выробляючай спажывецкія тавары, і, вядома, што ў БССР мы павінны, галоўным чынам, налягаць на разьвіцьцё гэтага віду прамысловасьці.

Акрамя таго, БССР, як частка Саюзу, павінна прымаць удзел у індустрыялізацыі ўсяго Саюзу ў цэлым.

Такім чынам неабходнасьць прадбачаньня пяцігодкай абавязковага паглыбленьня індустрыялізацыі для БССР мае такое першачарговае значэньне, як і для ўсяго Савецкага Саюзу.

Другое, што пяцігадовы плян павінен прадугледжваць? Гэта зжываньне дыспрапорцыі паміж колькасьцю рабочых рук і магчымасьцю іх гаспадарчага скарыстоўваньня (ліквідацыя беспрацоўя).

Трэцяе—пяцігадовы плян павінен прадугледжваць неабходнасьць устанаўленьня належных матар'яльных узаемаадносін паміж гаспадарчым і культурна-сацыяльным сэктарам. Гэта азначае, што мы павінны правільна разьмяркоўваць маючыяся ў дзяржавы сродкі на разьвіцьцё, з аднаго боку, гаспадарчага сэктару, а з другога—сацыяльна-культурнага.

Плянам павінна прадугледжвацца абавязковае, няўхільнае і паступовае далейшае павялічэньне ўдзельнае вагі сацыялістычнага сэктару ў агульным разьвіцьці народнае гаспадаркі. Гэта ёсьць цэнтральная задача пяцігадовага пляну, бо нам мала мець агульны ўзрост народнае гаспадаркі, нам трэба, каб гэты ўзрост праходзіў на ўзмацненьне сацыялістычных элемэнтаў, а ня прыватна-капіталістычных. Нам трэба, каб усё больш і больш удзельная вага сацыялістычнага сэктару народнай гаспадаркі ўзрастала, і, наадварот,—удзельная вага сэктару прыватна-капіталістычнага паслаблялася.

Пяцігадовы плян павінен прадугледжваць павялічэньне і дабрабыту працоўных мас (жыльлёвае будаўніцтва, заработная плата, культурна-асьветнае абслугоўваньне і г. д.). Трэба, каб побач з матар'яльным узмацненьнем нашае пралетарскае дзяржавы няўхільна паляпша-

лася і матар'яльнае становішча працоўных мас, а таксама культурнае іх абслугоўваньне.

Пяцігадовы плян таксама павінен забясьпечыць індустрыялізацыю краіны на больш высокай тэхнічнай базе, на базе электрыфікацыі, што ў сваю чаргу павінна павялічыць тэмп індустрыяльнага разьвіцьця.

Гаварыць аб індустрыялізацыі, не гаворачы аб усё большым узмацненьні тэхнічнай базы,—гэта значыць гаварыць упустую. Трэба, каб тэхнічная база ў нас усё больш узрастала, каб мы тут дагналі і перагналі капіталістычныя замежныя дзяржавы, тады бязумоўна перамога сацыялізму будзе цалком забясьпечана. Акрамя таго, аднэй з галоўных частак пяцігадовага пляну таксама павінна быць поўнае прадугледжваньне неабходнасьці ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны. Трэба будаваць нашы гаспадарчыя пляны так, каб у любы час, калі гэта запатрабуецца пралетарыяту, мы маглі-б перавесьці нашу гаспадарку і, галоўным чынам, прамысловасьць на абслугоўваньне ваенных патрэб дзяржавы, таму што, як усім вядома, мы будуем нашу сацыялістычную краіну ва ўмовах капіталістычнага абкружэньня, якое пагражае ўзброеным нападам на савецкую дзяржаву.

Вось тыя заўвагі і галоўныя галіны, якія павінны быць улічаны пры складаньні пяцігадовага пляну.

Цяпер дазвольце спыніцца больш падрабязна на разьвіцьці паасобных галін народнай гаспадаркі, якія праектуюцца і па якіх павінен зьезд камуністычнай партыі даць асноўныя паказаньні.

Першае, аб сельскай гаспадарцы. Пяцігадовым плянам у разьвіцьці сельскай гаспадаркі павінна быць прадугледжана поўная магчымасьць ажыцьцяўленьня курсу на індустрыялізацыю сельскай гаспадаркі, а таксама плянам павінна быць прадугледжана інтэнсыфікацыя і разьвіцьцё тэхнічных працаёмкіх культур. Мы павінны ўсё больш і больш ажыцьцяўляць ранейшыя дырэктывы мінулых зьездаў і пленумаў ЦК КП(б)Б аб ажыцьцяўленьні жывёлагадоўчага ўхілу ў нашай сельскай гаспадарцы.

Як плянам адбіваецца гэты напрамак інтэнсыфікацыі і індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі?

Лепей усяго для большае нагляднасьці паказаць гэты курс, які плянам мы павінны вызначыць у разьвіцьці сельскай гаспадаркі дыяграмай. На гэтай дыяграме адзначаны верхняй лініяй агульны ўзрост пасеўнай плошчы; скажам, калі ўзяць пачатковы год пяцігодкі 1927—28, то пасеўная плошча павінна раўняцца 3.243.600 дзес., у апошні год пяцігодкі (1931—32) пасеўная плошча ўзрастае да 3.736.100 дзесяцін або на 15 проц.; у 1924—25 г. пасеўная плошча раўнялася 2.762.000 дзесяцін, як відаць, у пачатковы год пяцігодкі мы таксама маем значны яе ўзрост супраць 1924—25 году.

Для таго, каб ажыцьцявіць курс па інтэнсыфікацыі сельскай гаспадаркі, мы павінны працаваць над перабудовай сельскай гаспадаркі, гэта значыць зрабіць належную перасоўку пасеўных культур у палyводзтве. Вось як будуць праходзіць зьмены ў пасеўнай плошчы тэхнічных культур: у 1924—25 годзе плошча пад тэхнічнымі культурамі раўнялася 93.400 дзесяцін; у пачатковым годзе пяцігодкі (1927—28) яна ўжо раўняецца 147,2 тысячы дзесяцін, а ў канцы пяцігодкі (1931—32 г.) яна будзе складаць 183,4 тысяч дзесяцін, альбо павялічыцца на 24,5 проц.

Як бачыце, узрост тэхнічных культур, які ў гады грамадзянскай вайны паменшыўся, будзе і павінен увесь час пашырацца Асабліва

*Дыяграма № 1.*

**Інтэнсыфікацыя сельскай гаспадаркі БССР.**




месца ў далейшым разьвіцьці сельскай гаспадаркі БССР будзе займаць бульба, як найбольш працаёмкая культура, якая можа павялічыць рэнтабэльнасьць сельскай гаспадаркі. З гэтай культурай мы маем такое становішча: у 1924—25 годзе валавы збор бульбы раўняўся 157.604,4 тысячы пудоў, у 1927—28 годзе (у пачатку пяцігодкі) ён складае 224.181 тысяча пудоў, а ў канцы пяцігодкі (1931—32 год) будзе складаць 286.123 тысячы пудоў або павялічыцца на 27,5 проц.

Збожжавыя культуры будуць расьці наступным чынам: у 1927—28 годзе будзе сабрана збожжавых культур 118.503,3 тысяч пудоў, у канцы пяцігодкі (1931—32 год) мы праектуем, што будзе сабрана 135.542,8 тысяч пудоў, гэта ёсьць узрост на 20 проц.

Некалькі даных адносна ільну-валакна: ільну-валакна ў гэтым гаспадарчым годзе мы сабралі 2.344,2 тысяч пудоў, а ў канцы пяцігодкі (1931—32 г.) праектуецца сабраць 3.594,8 тысяч пудоў, у той час, калі ў 1924—25 годзе было сабрана 1.626,3 тысяч пудоў, так што і па ільну-валакну ў нас будзе значны прырост.

Як бачыце, узрост агульнай пасеўнай плошчы будзе меншы, як пад тэхнічнай культурай, а таксама ўзрост працаёмкіх культур будзе большы, як збожжавых культур. Гэта адбівае напрамак унутранай перабудовы сельскай гаспадаркі ў бок яе інтэнсыфікацыі.

Як будзе павялічвацца валавая прадукцыя і таварная прадукцыя сельскай гаспадаркі? На дыяграмах №№ 2, 3 вызначаны рост валавой і таварнай прадукцыі сельскай гаспадаркі.

Па пяцігодцы праектуецца наступнае павялічэньне валавой прадукцыі—калі ў 1927—28 годзе валавая прадукцыя паляводзтва складае 306.125,1 тысяч даваенных рублёў, то ў 1931—32 годзе разьмеры валавой прадукцыі паляводзтва павінны дасягнуць да 375.376,5 тысяч



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*Дыяграма № 2.*

**Валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі.**

(У мільён. даваенных руб.)




ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

даваенных рублёў, альбо павялічэньне на 22,5 проц. У 1924—25 г. валавая прадукцыя паляводзтва складала 256.280,4 тысяч даваенных руб.

У галіне жывёлагадоўлі праектуецца наступны рост: у 1927—28 г. валавая прадукцыя жывёлагадоўлі складае 112.395 тысяч даваенных рублёў, у 1931—32 годзе праектуецца павялічэньне да 143.713,2 тысяч даваенных рублёў, альбо на 28 проц., а ў 1924—25 годзе валавая прадукцыя жывёлагадоўлі складала 104.533,7 тысяч даваенных рублёў. Як бачыце, тэмп росту валавой прадукцыі па жывёлагадоўлі вызначаны большы, як па паляводзтве.

Рост таварнай часткі сельскай гаспадаркі праектуецца наступным чынам: у 1927—28 годзе таварная частка па паляводзтве складае 40.684,3 тысячы чырвонных рублёў, у 1931—32 годзе таварная частка па паляводзтве будзе складаць 55.134,6 тысяч чырвонных рублёў, у той час, калі ў 1924—25 годзе яна складала 23.560,5 тысяч чырвонных р.

Па жывёлагадоўлі таварная частка прадукцыі ў 1924—25 годзе складала 25.862,4 тысяч чырвонных рублёў, у пачатку пяцігодкі (1927—28 годзе) яна складае 39.338,9 тысяч чыронных рублёў у канцы пяцігодкі (1931—32 годзе) яна павінна складаць 58.246,8 тысяч чырвонных рублёў. Як бачыце, таварная частка агульнай прадукцыі сельскай гаспадаркі будзе ўвесь час павялічвацца.

Мы лічым, што такі тэмп разьвіцьця сельскай гаспадаркі будзе выстарчальным, ён будзе таксама і рэальным, калі мы толькі ажыцьцё-

*Дыяграма № 3.*

**Таварнасьць сельскай гаспадаркі БССР.**

(У мільёнах рублёў).




вім усе тыя мерапрыемствы, якія вызначаюцца пяцігодкай у адносінах разьвіцьця сельскай гаспадаркі.

Другі малюнак наглядаецца ў адносінах лясное гаспадаркі. Гэтыя лічбы будуць сьведчыць аб тым, што лясная гаспадарка будзе мець менш прыросту валавое прадукцыі. Напрыклад, у 1925—26 годзе валавая прадукцыя лясное гаспадаркі раўнялася 38.141,8 тысяч руб., у пачатку пяцігодзьдзя (1927—28 г.) лясная гаспадарка дае валавое прадукцыі на 32.144,8 тысяч рублёў (значыць, зьменшылася), а ў канцы пяцігодкі (1931—32 г.) валавая прадукцыя лясное гаспадаркі будзе складаць 33.037,2 тысяч даваенных рублёў. Таварная частка таксама будзе мець прыблізна такі рост. Такое становішча лясное гаспадаркі тлумачыцца тым, што да гэтага часу эксплёатацыя лясных багацьцяў праводзілася не па пляне і што мы ня менш, як на 10—13 год высяклі лес наперад і таму на працягу пяці год трэба прыняць цэлы шэраг належных мер да ўпарадкаваньня эксплёатацыі лесу і галоўнае прыдзецца зьвярнуць увагу на лесаўпарадкаваньне. Тым больш мы гэта павінны зрабіць таму, што лясныя багацьці складаюць у нас асноўную і самую вялікую частку ў прыбытках нашага бюджэту.

Агульны рост у сельскай гаспадарцы, якi адзначан нашай пяцiгодкай, будзе магчымы тады, калi мы ажыцьцёвiм нашы прадугледжаньнi па ўзмацненьнi ўкладаньняў у сельскую гаспадарку.

Капiтальныя ўкладаньнi ў сельскую гаспадарку мы праектуем наступным чынам.

*Дыяграма № 4.*




Капiтальныя ўкладаньнi ў сельскую гаспадарку (у мiл. руб.).

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

На гэтай дыяграме паказаны як агульны рост капiтальных укладаньняў, таксама i ўзаемаадносiны памiж укладаньнямi ў паасобныя галiны сельскае гаспадаркi. Агульныя капiтальныя ўкладаньнi будуць выглядаць наступным чынам. У гэтым годзе (27—28 г.) мы ў сельскую гаспадарку ўкладваем па аграмаджаным сэктары 15.467 тысяч рублёў, а ў канцы пяцiгодкi (31—32 г.) капiтальныя ўкладаньнi павiнны павялiчыцца да 37.235 тыс. руб. у год або на 240 проц.

Як капiтальныя ўкладаньнi будуць разьмяркоўвацца ў паасобных галiнах селькае гаспадаркi? На зямляўпарадкаваньне i лесабудаўнiцтва ў гэтым годзе ўкладаецца 4.082 тыс. руб. або 26,5 проц. усiх укладаньняў; у 1931—32 годзе на зямляўпарадкаваньне i лесабудаўнiцтва—9.730 тыс. руб. або 26,1 проц. усiх укладаньняў. Тут мы бачым абсалютны рост асыгнаваньняў на зямляўпарадкаваньне i на арганiзацыю зямельнае плошчы.

Я лiчу, што мы правiльна паступаем, калi такi значны процант усiх капiтальных укладаньняў трацiм на зямляўпарадкаваньне. Гэта правiльна яшчэ i таму, што асноўнай прадпасылкай далейшага пасьпяховага разьвiцьця сельскай гаспадаркi зьяўляецца арганiзацыя зямельнай плошчы. Без зямляўпарадкаваньня няма чаго i думаць аб пасьпяховым культурным перавароце ў сельскай гаспадарцы.

Далей, значнае месца ў капiтальных укладаньнях займае мэлiярацыя; у 1927—28 г. на мэлiярацыю адпушчана 2.670 тыс. руб. або 17,3 проц. усiх укладаньняў, у канцы пяцiгодкi (1931—32 г.) мяркуецца за год затрацiць 8.515 т. руб. або 22,9 проц. Як бачыце, удзельная вага капiтальных укладаньняў у мэлiярацыю ў нас будзе значна павялiчана за гэтыя пяць год i гэта зусiм правiльна таму, што мэлiярацыя

ў далейшай працы па адбудаваньні сельскай гаспадаркі павінна займаць першае месца таму, што праз мэліярацыю мы зможам уцягнуць у агульна-гаспадарчы зварот большую плошчу зямлі. А гэтым самым яна будзе дапамагаць зьмяншэньню аграрнай перанаселенасьці беларускай вёскі, не гаворачы ўжо аб тым, што гэта будзе мець таксама значны ўплыў на павялічэньне агульнага ўзросту валавое прадукцыі сельскае гаспадаркі.

На ўкладаньнях у іншыя галіны сельскай гаспадаркі я спэцыяльна спыняцца ня буду, я спынюся толькі на ўкладаньні ў аграмаджаны сэктар сельскай гаспадаркі.

Калі ўзяць савецкія гаспадаркі, арцелі і калектыўныя гаспадаркі, што складае асноўны грунт аграмаджанай сельскай гаспадаркі, то тут справа высьвятляецца наступным чынам. У першым гозде пяцігодкі (у 1927—28 г.) капітальныя ўклады складаюць 1.425 тыс. руб. або 9,2 проц., у канцы пяцігодкі (31—32 г.) абсалютная сума ўзрасьце да 2.215 тыс. руб., а ўдзельная вага зьменшыцца да 6,1 проц. замест 9,2 проц.

Я лічу патрэбным выказаць свой погляд аб тым, што сума, запраектаваная па ўкладаньнях у аграмаджаны сэктар, зьяўляецца малой. Мы павінны пераглядзець нашы мерапрыемствы ў адносінах разьмеркаваньня сродкаў на капітальныя ўкладаньні па паасобных галінах нашай сельскай гаспадаркі.

Калі мы калектыўныя і савецкія гаспадаркі ня будзем увесь час узмацняць пры дапамозе капітальных укладаньняў з боку дзяржавы, то мы ня зможам дабіцца таго, каб яны справіліся з тэй задачай, якую на іх ускладае партыя.

Нічога тут страшнога ня будзе, калі мы іх будзем падтрымоўваць да таго часу, пакуль яны самі ня стануць моцна на ногі. Але гэта мая асабістая думка.

Вось, напрыклад, той матэрыял, які дае вам магчымасьць судзіць аб тых мерапрыемствах, якія будуць зроблены на працягу бліжэйшых пяці год у адносінах развіцьця сельскай гаспадаркі, а таксама і тыя прадугледжаныні ў пяцігадовым пляне па частцы агульнага ўзросту сельскай гаспадаркі, а таксама характар і тэмп інтэнсыфікацыі і індустрыялізацыі.

Трэба адзначыць, што праектам пяцігадовага пляну, які вам даны ў якасьці матар'ялу, невыстарчальна ўлічаны ўкладаньні тых капіталаў, якія будуць праведзены самім сялянствам.

Цяпер дазвольце спыніцца на тэй частцы пяцігодкі, якая вызначае нашы мерапрыемствы ў адносінах да прамысловасьці. У пачатку 5-годкі (у 1927—28 г.) валавая прадукцыя ўсёй прамысловасьці (без саматужна-мукамольнай) раўняецца ў чырвонным вылічэньні 242.821,9 тысяч рублёў. Валавая прадукцыя ўсёй дзяржаўнай прамысловасьці ў даваенных рублёх раўняецца 123.913,1 тыс. рублёў, а ў 1931—32 г. валавая прадукцыя ўсёй прамысловасьці ў чырвонным вылічэньні павінна складаць 345.357,1 тыс. руб., а па даваенных цэнах павінна складаць 199.454,2 тысяч руб., а валавая прадукцыя ў 1925—26 годзе складала па чырвонным вылічэньні 209,4 тыс. руб., а па даваенных цэнах— 96.786 тыс. руб.

Як бачыце, тэмп росту бярэцца крыху меншы, як у гэтым годзе.

Таварная частка прадукцыі ўсёй прамысловасьці (без саматужнай і мукамольнай) у чырвонным вылічэньні ў 1925—26 г. раўнялася 156.726,3 тыс. руб., а ў 1927—28 годзе павінна павялічыцца да 189.940,7 тысяч руб., а да канца пяцігодкі (1931—32 г.) таварная частка прадукцыі прамысловасьці павінна складаць 285,712,2 тысячы руб.

*Дыяграма № 5.*

**Рост прадукцыі прамысловасьці БССР.**

(У міл. дав. руб.).




На гэтай дыяграме адзначаны рост валавое прадукцыі па паасобных частках прамысловасьці, гэта значыць, па прамысловасьці ВСНГ, па ўсёй дзяржаўнай прамысловасьці і па ўсёй разам—асобна. Найбольшы рост будзе мець прамысловасьць ВСНГ. Агульны рост валавое прадукцыі прамысловасьці па дадзеных цэнах праектуецца 83,3 проц.

Як праектуюцца капітальныя ўкладаньні прамысловасьці, гэта відаць з наступных лічбаў. Найбольшы рост капітальных укладаньняў у нашу прамысловасьць праходзіў у 1926—27 г. Напрыклад: у 1925—26 г. капітальныя ўкладаньні ў нашу прамысловасьць складалі 7.064 тысячы р., а 1926—27 г. мы маем павышэньне да 14.249 тыс. р.; у пачатку пяцігодкі (1927—28 г.) капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць будуць складаць 21.903 тысячы рублёў, а ў канцы пяцігодкі (1931—32 г.) капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць будуць складаць 23.355 тыс. руб. у год, значыць, менш, як у 1930—31 г. таму, што ў 31—32 годзе яны будуць складаць 26.729 тысяч. руб. Усяго капітальных укладаньняў за пяць год у прамысловасьць мы павінны зрабіць 126.050 тыс. руб.

Як вы бачыце, агульны аб'ём капітальных укладаньняў мы лічым вельмі значным. Пры ажыцьцяўленьні гэтых праектаў мы мелі-б больш магчымасьці ўзмацніць удзельную вагу нашай прамысловасьці ў агульнай народнай гаспадарцы. Капітальныя ўкладаньні па гадох будуць разьмяркоўвацца няроўнамерна. У 1929—30 годзе яны ня будуць павялічаны ў адносінах да 1927—28 г. Гэта тлумачыцца тым, што ў пачатку пяцігадовага пляну праектуецца пабудаваць цэлы шэраг новых прадпрыемстваў, якія патрабуюць значных выдаткаў.

Вялікае значэньне ў разьвіцьці нашай прамысловасьці павінна мець праца па зьніжэньні сабекошту прамысловай вытворчасьці. Мы цяпер ня можам пахваліцца значнымі дасягненьнямі ў гэтай галіне. Мусіць мала знойдзецца такіх дырэктароў прадпрыемстваў, якія вы-

шлі-б сюды на трыбуну і пахваляліся-б зьезду значнымі посьпехамі ў патаненьні сабекошту прадукцыі. Паасобныя галіны прамысловасьці маюць дасягненьні ў гэтай працы, але ёсьць такія галіны прамысловасьці, якія замест патаненьня правялі ўздаражэньне сабекошту прамысловай вытворчасьці.

Па пяцігодцы мы павінны даць абавязковую дырэктыву патаненьня сабекошту ня менш, як на 18,5 проц. У матар'ялах пяцігодкі гэты процант вызначан, яго трэба цалком утрымаць, бо гэта мае вялікае значэньне ў разьвіцьці нашай прамысловасьці, бо мы павінны абавязкова канкураваць з прадукцыяй прамысловасьці капіталістычных дзяржаў, а гэта можна толькі рабіць тады, калі мы будзем танна выробляць. У пяцігодцы таксама праектуецца патаненьне індэксу адпускных цэн цэнзавай дзяржаўнай прамысловасьці: усяго за пяць год к канцу пяцігодкі на 17,2 проц. Гэтую задачу таксама мы павінны паставіць ва ўвесь рост перад нашымі гаспадарчымі і плянуючымі органамі і абавязкова дабіцца зьніжэньня адпускных цэн на тавары прамысловасьці. У гэтым ёсьць асноўны курс нашае партыі.

Мы толькі што закончылі спэцыяльную кампанію па патаненьні адпускных цэн на прадукты прамысловасьці. Трэба вызначыць, што адпускныя цэны мы патанілі, але значная частка гэтага пайшла за кошт прыбыткаў прамысловасьці. Нашу задачу мы павінны ставіць зусім інакш, каб зьніжэньне адпускных цэн праходзіла за кошт рацыяналізацыі прамысловасьці, за кошт зьніжэньня накладных выдаткаў у нашым гаспадарчым апараце, за кошт усё большай рацыяналізацыі вытворчасьці і лепшай арганізацыі працы.

У зьвязку з тым, што далейшае падрабязнае высьвятленьне мерапрыемстваў у галіне прамысловасьці патрабавала-б шмат часу, я на гэтым скончу і спынюся толькі спэцыяльна на тым, як праектуемае пашырэньне прамысловага будаўніцтва адаб'ецца на павялічэньні колькасьці прамысловых рабочых. Лік рабочых ва ўсёй прамысловасьці (без саматужнай і мукамольнай) у 1925—26 г. быў 37.197 чалавек, у пачатку плянавага году (1927—28 г.) мы маем 43.786 чал., а ў канцы пяцігодкі (1931—32 г.) мы лічым, што лік рабочых узрасьце да 60.245 чал. Сюды не ўваходзяць рабочыя-чыгуначнікі.

Заработная плата на месяц будзе мець такія зьмены: калі ў 1927—28 г. сярэдняя зарплата на месяц складае 56,6 руб., то ў канцы пяцігодкі яна павінна павялічыцца да 64 руб. у месяц, або (намінальная зарплата) павялічыцца на 21 проц.

Тут можа зьявіцца думка ў таварышоў аб тым, што павялічэньне заработнай платы бярэцца нізкае, але трэба мець на ўвазе тое, што зарплата будзе павышацца ня толькі ў зьвязку з намінальным павялічэньнем яе, але яна будзе павялічвацца і ў зьвязку з цэлым шэрагам тых мерапрыемстваў, якія мы прадугледжваем у пяцігодцы; напрыклад, такімі: патаненьне цэн на спажывецкія прадукты, патаненьне вырабу прамысловых прадуктаў, зьніжэньне адпускных цэн і г. д. Такім чынам, рэальнае павялічэньне заработнай платы праектуецца для прамысловых рабочых на 49,5 проц.

Трэба адзначыць, што ў дакладзе тав. Струміліна на пасяджэньні Дзяржаўна-Плянавай Камісіі Саюзу ССР адзначалася, што рэальны заработак па іх меркаваньні павінен быць ад 50 да 54 проц. Мы лічым, што калі нам удасца ажыцьцявіць павялічэньне на 49 проц., уключаючы сюды як намінальнае павышэньне, так і вынікі тых мерапрыемстваў, якія будуць праведзены адносна павялічэньня рэальнага значэньня заработнай платы, то гэта будзе значным дасягненьнем.

Цяпер мая асабістая думка наконт намінальнага павялічэньня заработнай платы. Я лічу, што нам пры канчатковым складаньні пяцігодкі трэба будзе ўзяць курс на павялічэньне больш як на 20 проц. Гавару я аб гэтым на падставе таго, што першы варыянт пяцігодкі ўлічваў неабходнасьць павялічэньня заработнай платы ў месяц да 29 проц. Такім чынам, можна сьмела браць курс на тое, каб магчыма было павялічыць процантаў на 25, а ня менш. Але гэта ёсьць мая асабістая думка, і сапраўднае вызначэньне росту заработнай платы яшчэ будзе не адзін раз пераглядацца, як на пасяджэньнях Бюро ЦК, таксама і пленумаў ЦК, якія ўстановяць канчатковую лічбу намінальнага павышэньня зарплаты.

Трэба азначыць некалькімі лічбамі, як павялічваецца выработак на аднаго рабочага ў год. Калі вымяраць па даваенных цэнах, то гэта будзе так: у 1925—26 годзе гадавы выработак аднаго рабочага даходзіў да 1.744 руб., у пачатку плянавага пэрыяду (у 1927—28 г.) будзе 2.005 р., а ў канцы пяцігодкі (1931—32 г.) выработак павялічыцца на 2.544 рублі. Гэтаму павышэньню будзе спрыяць цэлы шэраг умоў, якія будуць складацца ў нашай прамысловасьці.

Перад тым, як закончыць характарыстыку пэрспэктыўнага разьвіцьця прамысловасьці, дазвольце падаць лічбы, якія будуць сьведчыць, наколькі наша прамысловасьць дапамагае індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі шляхам перапрацоўкі сельска-гаспадарчай сыравіны. Няма чаго гаварыць аб тым, што большая частка прамысловасьці БССР прыстасавана для перапрацоўкі сыравіны сельскай гаспадаркі, напрыклад, вялікую ўдзельную вагу займае ў нас харчовая прамысловасьць, якая даходзіць у гэтым годзе да 23,2 проц., а таксама тэкстыльная прамысловасьць, якая перапрацоўвае тэхнічныя культуры нашай сельскай гаспадаркі.

Вось лічбы, якія сьведчаць аб тым, што наша прамысловасьць у кожным годзе павялічвае перапрацоўку сельска-гаспадарчых прадуктаў, напрыклад, броварная прамысловасьць у 1926—27 годзе перапрацоўвала 83.349 тон бульбы, а ў 1927—28 годзе (гэта значыць у пачатку пяцігодзьдзя) мы ўжо праз нашу прамысловасьць перапрацуем бульбы 127.323 тоны, а ў канцы пяцігодкі (у 1931—32 г.) перапрацоўка бульбы на нашых прадпрыемствах дойдзе да 336.181 тоны ў год. Як бачыце, даволі значны ўзрост перапрацоўкі працаёмкіх культур сельскай гаспадаркі.

Наконт валакна і ільну. Наша тэкстыльная прамысловасьць адрозьніваецца ад тэкстыльнай прамысловасьці іншых раёнаў Саюзу тым, што яна толькі перарабляе лён, каноплі і льна-валакно, у той час, калі ў Маскоўскай губэрні тэкстыльная прамысловасьць вырабляе шарсьцяную мануфактуру і г. д.

Наша тэкстыльная прамысловасьць перапрацоўвае льна-валакна наступную колькасьць: у 1926—27 годзе—4.363 тоны, у 1927—28 г. (у пачатку плянавага пэрыяду) 5.194 тоны, у канцы пяцігодкі (у 1931—32 г.) гадавая перапрацоўка льна-валакна павінна павялічыцца да 9.508 тон. Праз маслабойную прамысловасьць мы перарабляем ільнянное семя: у 1926—27 годзе—13.599 тон, у 1927—28 г.—16.304 тоны, а ў канцы пяцігодкі (у 1931—32 г.)—27.637 тон.

Скураная прамысловасьць вырабляе ў год наступную колькасьць скур: у 1926—27 г. дробных—591 тыс., буйных—185 тыс., у 1927—28 годзе—дробных 721 тысячу, буйных—216 тысяч. У канцы пяцігодкі (у 1931—32 г.) дробных—882 тысячы і буйных—324 тысячы. Гэтыя лічбы паказваюць, як наша прамысловасьць зьвязана з сельска-гаспадарчай вытворчасьцю, дапамагае індустрыялізаваць сельскую гаспа-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

дарку. Гэта мае вялікае значэньне як для разьвіцьця сельскай гаспадаркі, таксама і для разьвіцьця прамысловасьці, бо прамысловасьць зьяўляецца вялікім рынкам для збыту сельска-гаспадарчага сырцу.

Дазвольце спыніцца на электрыфікацыі. Усім вядома, што электрыфікацыя павінна зьяўляцца асноўнай падставай тэхнічнага разьвіцьця нашай краіны. Індустрыялізацыя тады будзе мець значны посьпех, калі яна будзе грунтавацца на высокай тэхніцы, г. зн. на высокай тэхнічнай базе.

Як практычна будзе ажыцьцяўляцца справа ў нас з электрабудаўніцтвам? Становішча з электрабудаўніцтвам і з бліжэйшымі пэрспэктывамі можна характарызаваць наступным. Магутнасьць электрычных станцый у 1927—28 годзе (у першым годзе пяцігодкі) складае 12.190 кілёўат у той час, калі ў 1924—25 годзе было толькі 8.160 кілёўат, а ў канцы пяцігодкі магутнасьць электрычных станцый дойдзе да 64.630 кілёўат. Як бачыце, будзем мець узрост магутнасьці электрычнай станцыі ў пяць раз (500 проц.).

Калі ўзяць агульны выраб электрычнай энэргіі ў мільёнах кілёўат-гадзін, то малюнак будзе наступны: у 1927—28 г. ўсяго вырабляецца электрычнай энэргіі 30.850.000 кілёўат-гадзін, у той час, калі ў 1924—25 годзе яе выраблялася толькі 19.180 т. кілёўат-гадзін, а ў канцы пяцігодкі выпрацоўка дойдзе да 150.670 тысяч кілёўат-гадзін. Як вы бачыце, будзем мець вялізарнае павялічэньне выпрацоўкі электрычнай энэргіі.

Адносна сабекошту электраэнэргіі. Сабекошт электраэнэргіі абыходзіўся ў 1924—25 годзе ў 15½ кап. за кілёўат-гадзіну, у пачатку плянавага пэрыяду (у 1927—28 г.) сабекошт электрычнай энэргіі—13,2 кап., як вы бачыце, некаторае патаненьне, а ў канцы плянавага пэрыяду сабекошт дойдзе до 6 кап., гэта значыць, сабекошт паменшыцца больш, як у два разы.

Вялікае значэньне ў гэтых лічбавых зьменах і ў росьце электрабудаўніцтва ў нас адыграе Асінстрой. Гэта раённая электрычная станцыя, якая сваёй магутнасьцю пакрые ўсе электрычныя станцыі, якія ў нас ёсьць на Беларусі. Скончыўшы будаўніцтва Асінстрою ў 1929 годзе, мы ў гэтым годзе будзем мець такі вялікі скачок як у магутнасьці электрычных станцый, так і ў колькасьці вырабляемай электрычнай энэргіі і патаненьня яе сабекошту.

Якія грашовыя асыгнаваньні будуць праходзіць на электрычнае будаўніцтва? На раённа-электрычныя станцыі ў мінулыя гады зусім не адпушчаліся грошы. Будаваліся толькі электрычныя станцыі гарадзкія, фабрычна-заводзкія і зусім у малым ліку разгортвалася сельскае электрычнае будаўніцтва. У 1926—27 годзе ўжо маюцца асыгнаваньні на будаўніцтва раённых электрычных станцый 800 тысяч рублёў. Гэта складала 31,8 проц. усіх асыгнаваньняў на электрычнае будаўніцтва; у пачатку пяцігодкі (1927—28 годзе) асыгнаваньне на раённае электрычнае будаўніцтва будзе складаць 3.620 тысяч руб., або 55,5 процантаў з агульнай сумы асыгнаваньняў на электрычнае будаўніцтва ў гэтым годзе (6.520 тысяч рублёў). У 1928—29 годзе асыгнаваньне на будаўніцтва раённых электрычных станцый будзе складаць 4.200 тысяч рублёў, або 52,7 процантаў з агульнай сумы ў 7.970 тыс. р. У гэтым годзе агульнае ўкладаньне на электрычнае будаўніцтва за гэтыя пяць год самае найбольшае. У апошнім плянавым годзе (у 1931—32) агульнае асыгнаваньне дасягне 5.670 тысяч рублёў і ў далейшым яны будуць павялічвацца таму, што мы да сканчэньня пабудовы Асінстрою павінны пачаць працу па дасьледваньні і высьвятленьні магчымасьці пабудовы новай раённай электрычнай станцыі.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*Дыяграма № 6.*

**Электрабудаўніцтва ў БССР.**




ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Як бачыце з дыяграмы і лічбаў, якія агалошаны, электрычнае будаўніцтва ў нас будзе займаць вельмі значнае месца. Трэба адзначыць, што адзін Асінстрой дасьць нам поўную магчымасьць палепшыць структуру нашае народнае гаспадаркі, асабліва тых раёнаў, якія яна будзе абслугоўваць, гэта па Аршанскай, Віцебскай і Магілеўскай акругах. З гэтае прычыны намячаецца на бліжэйшы плянавы пэрыяд пабудова новых фабрык і заводаў, больш за ўсё ў тых раёнах, якія будуць абслугоўвацца энэргіяй Асінстрою.

Дазвольце некалькі слоў сказаць аб жыльлёвым будаўніцтве. Уся наша праца па разьвіцьці прамысловасьці цалкам сустракаецца з жыльлёвым крызісам. Гаварыць аб разгортваньні прамысловага будаўніцтва і не гаварыць аб жыльлёвым будаўніцтве, гэта азначае, што праграма прамысловага будаўніцтва была-б ня выканана. Гэтыя пытаньні зьвязаны адно з другім, тым больш, што ў БССР мы маем вялікі кватэрны крызіс. Напрыклад, санітарная норма на адну душу насельніцтва павінна быць у 16,3 квадратовых аршын, а ў нас ёсьць 11,62 квадратовых аршын, значыць, мы маем значна меншую плошчу на душу насельніцтва, як патрабуецца па санітарных умовах.

Таму правільна паступае Дзяржаўная Плянавая Камісія БССР, калі яна, распрацоўваючы пяцігодку, ставіць задачу, што мы на працягу першага плянавага пэрыяду павінны давесьці жыльлёвую плошчу ха-

ця-б да нормы, якая ў нас была ў 1924—25 г., гэта да 6,06 квадратовых мэтраў, таму што яна цяпер значна меншая. Напрыклад, у 1927—28 годзе кватэрная плошча на душу насельніцтва складае 5,82 квадр. мэтраў, а ў 1931—32 г. мяркуецца яе давесьці да 6,06 квадратовых мэтраў. Але і для гэтага патрабуецца вялікая напружанасьць ад нашых гаспадарчых органаў, а таксама і патрабуецца шмат сродкаў; асыгнаваньні на кватэрнае будаўніцтва за гэтыя пяць год мы думаем зрабіць у 50 мільёнаў руб., а капітальныя ўкладаньні ў новае кватэрнае будаўніцтва па 10 буйных гарадох будуць выглядаць наступным чынам: у 1927—28 г. яны будуць складаць 10,04 мільёнаў руб. у той час, калі ў 1925—26 г. яны складалі ўсяго 5,15 мільёнаў руб.; па раённых гарадох і мястэчках капітальныя ўкладаньні будуць складаць 2,7 мільёнаў руб. у той час, калі яны складалі ў 1925—26 г. 1,6 мільёнаў руб., а ў канцы пяцігодкі капітальныя ўкладаньні па 10 буйных гарадох будуць складаць 19,30 мільёнаў рублёў у год, а па мястэчках і раённых гарадох яны будуць у канцы пяцігодкі складаць 4 мільёны руб.

Як бачыце, сумы вялікія, але іх не хапае для таго, каб зьнішчыць жыльлёвы крызіс. Новая плошча за гэтыя пяць год павінна павялічыцца на 201 з пал. тысяч квадр. мэтраў. Па гадох яна будзе разьмяркоўвацца наступным чынам: у 1927—28 годзе ў 10 буйных гарадох будзе пабудована 102 з пал. тысяч квадр. мэтраў у той час, калі ў 1925—26 г. яе будавалася 62,9 тысяч квадр. мэтраў, а ў канцы пяцігодкі—1931—32 г., я думаю, нам удасца давесьці пабудову кватэрнай плошчы ў год да 201 з пал. тысяч квадр. мэтраў.

Характэрна адзначыць, што па тых матар'ялах, якія паданы Дзяржаўнай Плянавай Камісіяй, насельніцтва гарадоў павялічыцца на 85 тысяч чалавек за першае пяцігодзьдзе, а кватэрная плошча павялічыцца больш як на 200 тысяч кв. мэтраў, але норма квадратнай плошчы на адну душу насельніцтва яшчэ ня дойдзе да санітарнай нормы.

Гэта вынікае з таго, што побач з пабудовай новых будынкаў мы будзем мець некаторую ўцечку карысна-жыльлёвай плошчы. Трэба адзначыць, што праектуецца тэмп росту кватэрнага будаўніцтва большы як сярэдні тэмп росту па Савецкім Саюзе. Мы лічым, што маем на гэта права, таму што, як нідзе, у нас зруйнованы жыльлёвы фонд былымі акупацыямі, імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайной, і ні адзін раён Савецкага Саюзу так не разбураны, як Савецкая Беларусь. Таму мы ставім пытаньне аб тым, каб мы былі прыраўнаваны да такіх раёнаў СССР, у якіх жыльлёвае будаўніцтва будзе праходзіць больш шпаркім тэмпам.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна
азнаёміцца ў бібліятэцы